# ПРАВАСЛАЎНАЯ ЦАРКВА І ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАЛІТЫКА РАСІЙСКІХ УЛАД У СФЕРЫ РАСПАЎСЮДЖВАННЯ ІДЭЙ ЦВЯРОЗАСЦІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТСТ.

*С. В. Мяньчэня*
*(Мінск, Беларусь)*

Ратаванне душы ад спакусы і грахоў з'яўляецца клопатам не толькі самога чалавека, але і царквы. А што, як ні алкаголь, цягне чалавека да граха? Праваслаўная царква заўсёды займала па гэтаму пытанню адназначную пазіцыю, што аднак разыходзілася з пазіцыяй свецкіх улад. Разгледзім вопыт узаемадзеяння царквы і свецкіх улад у сферы распаўсюджвання ідэй цвярозасці на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX стст.

Першыя вядомыя у Расійскай імперыі таварыствы цвярозасці ўзніклі ў Ліфляндскай губерні. У 1836 г. пастар Кельбрандт склаў першы статут таварыства цвярозасці, пад якім падпісалася 50 прыхажан, і накіраваў яго на зацвярджэнне губернатару [20, с. 972]. Тады ўлады не толькі не зацвердзілі дакумент, але і забаранілі пастарам весці агітацыю за адмову ад гарэлкі, аднак паступова цвярозы рух шырыўся і перакінуўся на літоўска-беларускія губерні. У 1859 г. рух дасягнуў піка развіцця, на тэрыторыі Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў у ім, па падліку навукоўцаў, прыняло ўдзел каля 475 тыс. чалавек, пераважна з заходняй часткі сучаснай Беларусі і Літвы [18, с. 55]. У гэты ж час аформіліся і таварыствы цвярозасці – як каталіцкія, так і праваслаўныя. У 1860 г. мітрапаліт Літоўскі і Віленскі Іосіф (Сямашка) выказаў падзяку праваслаўным святарам за актыўную працу ў гэтым накірунку [7, с. 485], аднак агульная пазіцыя як царквы, так і свецкіх улад у дачыненні да цвярозага руху была больш чым стрыманая. Мітрапаліт Маскоўскі

Філарэт выказваўся, што хоць сама ідэя цвярозасці з'яўляецца добрай, рэалізацыя яе праз стварэнне арганізацый парушае прынцып дабраахвотнасці, а мэта таварыстваў «произвести расстройство в одной из отраслей государственного дохода» [7, с. 487]. Генерал-губернатар Назімаў патрабаваў ад Ковенскага епіскапа ліквідаваць каталіцкія таварыствы, але той адмовіўся. Моцны удар па таварыствам нанёс М. Мураўёў, у выдадзеным ім цыркуляры каталіцкія таварыствы цвярозасці былі абвешчаны нелегальнымі арганізацыямі, за удзел у якіх уводзілася жорсткая адказнасць. Праваслаўныя таварыствы зніклі яшчэ раней, на працягу 1860 – 1861 гг., у выніку падаўлення цвярозага руху [7, с. 488]. У савецкай гістарыяграфіі цвярозы рух 1859–1861 гг. разглядаўся як народны, што датычыцца ролі царквы, то тут пазначалася, што яна не толькі не спрыяла развіццю ідэй цвярозасці, але і тармазіла гэты працэс [6, с. 12].

Новы этап ў распаўсюджванні ідэй цвярозасці пачаўся ў канцы 80-х гг. XIX ст. Улады у той час пачалі барацьбу з нелегальным гандлем. Разам з узмацненнем кантроля адбываліся змены ў структуры продажу алкагольных напояў – замест распівачнага рабілася стаўка на вынасны гандаль. Праваслаўная царква не засталася ў баку. У ліпені 1889 г. Свяшчэнны Сінод заклікаў святароў да ўзмацнення барацьбы з п'янствам і не дапускаць дробнага продажу алкагольных напояў на царкоўнай і манастырскай зямле [10, с. 86]. Да канца 1889 г. на тэрыторыі сучаснай Беларусі узнікаюць праваслаўныя таварыствы цвярозасці пры Вылеўскай царкве Гомельскага павета (67 удзельнікаў) і пры Бярозкаўскім прыходзе Клімавіцкага павета (70 чал.), а ў 1890 г. – у с. Брашэвічы Кобрынскага павета (70 чал.), в. Грыцэвічы Слуцкага павета. Першыя тры ў хуткім часе перасталі існаваць, бо сяляне не падтрымалі ідэю абсалютнай цвярозасці і не адмовіліся ад спажывання алкаголя па святах [3, с. 9–10].

Падрабязнае апісанне таварыства цвярозасці ў Грыцэвічах сустракаецца ў працы М. Грыгор'ева «Русские общества трезвости, их орга-

низация и деятельность». Стваральнікам таварыства і яго кіраўніком быў святар М. Петрапаўлаўскі, у лік таварыства ўваходзілі настаўнік Валынцаў, царкоўны стараста Хмялеўскі, валасны старшыня Корсюк, пісар Шмакаў, сяляне Веліч, Магілевіч, Васілеўскі і Грынкевіч. Пры ўступленні ў таварыства служыўся малебен Св. Пятру і Паўлу і даваўся абет цвярозасці; за парушенне яго – вымова, штраф ці выгнанне з таварыства. Члены таварыства павінны былі не ставіць сабе вышэй і не хваліцца сваёй цвярозасцю перад іншымі. Запісацца ў таварыства і даць абет цвярозасці можна было на ўсё жыццё, на год, ці на час Вялікага Паста, большая частка ўдзельнікаў таварыства адмаўлялася ад спажывання алкаголя толькі на пэўны тэрмін. Таварыства мела невялікую чайную, дзе прадавалася гарбата па 1 кап. за порцыю. За чатыры гады (1890– 893) абет цвярозасці быў парушаны толькі аднойчы [4, с. 74].

З 1894 г. у Расійскай імперыі пачала паступова ўводзіцца дзяржаўная манаполія на вытворчасць і продаж гарэлкі, разам з гэтым дзяржава абвесціла палітыку распаўсюджвання ідэй цвярозасці. Цвярозасць разумелася як памеранае, «культурнае» спажыванне алкагольных напояў. Праваднікамі дадзенай палітыкі павінны былі стаць папячыцельствы аб народнай цвярозасці. Акрамя культурна-асветніцкіх функцый на іх ускладаўся кантроль за гандлем алкаголем. З 1 ліпеня 1897 г. дзяржаўная манаполія распаўсюдзілася на тэрыторыю беларускіх і літоўскіх губерняў. Перад праваслаўнай царквой паўстала пытанне: як аднесціся да такой дзяржаўнай пазіцыі адносна цвярозасці? Улады чакалі ад царквы падтрымкі, святары лічыліся «самым надёжным элементом, при помощи которого можно осуществлять свои планы» [13, арк. 151]. Ды і само праваслаўнае духавенства падтрымала ідэю папячыцельстваў: 27 ліпеня 1897 г. архіепіскап Іеранім звярнуўся з адозвай да святароў Літоўскай епархіі: «желание сердца моего и, думаю, всех сочувствующих благу народа, чтобы духовенство приняло непосредственное участие в деятельности

Попечительств о народной трезвости» [8, с. 1–2]. Святары, карыстаючыся сваім аўтарытэтам, павінны былі весці тлумачальную працу з насельніцтвам.

У асабовым складзе папячыцельстваў беларускіх губерняў у 1900 г. святары займалі наступныя месцы: 22,6% (1 месца) сярод участковых папячыцелей пры сярэднім паказчыку па краіне 16,3%; сярод членаўспаборнікаў – 17,6% (2 месца) пры сярэднім 16,2% [21, с. 11–12].

У справаздачах папячыцельстваў духавенства праходзіць адзінай лічбай без падзелу на католікаў і праваслаўных. Выявіць сярод членаў папячыцельстваў ксяндзоў дазваляюць толькі паімённыя спісы, якія зацвярджаліся губернскімі камітэтамі, і ў адрозненні аб спісу абавязковых членаў захаваліся дастаткова дрэнна. Акрамя спісу жадаючых прыняць удзел у працы камітэта губернскія камітэты разглядалі яшчэ і «Списки лиц, которые могут быть привлечены к деятельности комитета», якія складаліся павятовымі спраўнікамі. Па практыцы гэтыя спісы маглі карэнным чынам не супадаць. У якасці прыкладу, можна прывесці сітуацыю, якая склалася ў Люцынскім павеце Віцебскай губерні. Тут у якасці жадаючых выступала 78 чал., з якіх 46 былі сяляне, 2 настаўніка, 6 каталіцкіх святароў і ніводнага праваслаўнага. У спісе, які падаў у губернскі камітэт спраўнік налічвалася ўсяго 58 чал. з якіх сялян і каталіцкіх святароў засталося толькі па два, затое з'явіліся 5 праваслаўных і 12 настаўнікаў [16, арк. 24–25, 29–32, 34–36]. Як бачна, улады імкнуліся абмежаваць удзел у працы папячыцельстваў пэўныя групы насельніцтва. Калі ж абмежаваць удзел не атрымлівалася, то рабілася спроба захаваць кантроль з боку лаяльных катэгорый. Так у Лідскім павеце ў 1901 г. губернскі камітэт зацвердзіў членамі-спаборнікамі 10 ксяндзоў, але ўчастковымі папячыцелямі прызначыў праваслаўных святароў [14, арк. 72–75].

Папячыцельствы аб народнай цвярозасці дасягнулі пэўных поспехаў у арганізацыі народных чайных і бібліятэк, правядзенні гулянняў, лекцый, аднак істотнае скарачэнне фінансаванне і змены ў

дзяржаўнай антыалкагольнай палітыцы з 1904 г. прывялі да спынення іх актыўнай дзейнасці і страты актывістаў. Рост спажывання алкаголя абумоўлівае пошук новых форм барацьбы, адбываецца афармленне і інстытуалізацыя новага этапа цвярозага руха. Тэарэтыкамі яго выступалі знакаміты навуковец М. Бехцераў, адвакат А. Коні, самарскі прадпрымальнік М. Чэлышаў. Значную ролю ў ім адыгралі і епіскап Мітрафан (Краснапольскі) і Дз. Булгакоўскі, дзейнасць якіх была цесна звязана з Беларуссю [12; 22].

У снежні 1907 г. у ІІІ Дзяржаўнай думе была створана Камісія аб мерах па барацьбе з п’янствам, куды ўвайшло 22 дэпутата. Старшынёй камісіі быў абраны епіскап Мітрафан, а яе ідэйным лідэрам стаў М. Чэлышаў. Камісія павінна была вызначыць асноўныя накірункі антыалкагольнай палітыкі дзяржавы і ўнесці папраўкі ў заканадаўства з мэтай адмовы ад палітыкі «п’янага бюджэта».

12 чэрвеня 1909 г. Свяшчэнны Сінод распаўсюджвае ўказ з праэктам аб запрашэнні духавенства да барацьбы з народным п’янствам. У ўказе падкрэслівалася актыўная пазіцыя царквы ў барацьбе з п’янствам у 50-я гг., калі Сінод падтрымаў святароў (што было вельмі спрэчным тэзісам), указ 1889 г.. Зараз патрабаваліся новыя меры: арганізацыя таварыстваў цвярозасці, брацтваў, царкоўных саветаў, пропаведзі супраць п’янства павінны былі стаць абавязковымі для ўсіх святароў, у семінарыях планавалася стварыць асобны аддзел антыалкагольнай літаратуры у бібліятэках, пры выкладанні гігіены настаўнікам трэба звяртаць увагу на наступствы п’янства, набыць наглядныя дапаможнікі [17, с. 301–302].

28 снежня 1909 – 6 студзеня 1910 г. у Пецярбургу прайшоў першы Ўсерасійскі з’езда па барацьбе з п’янствам. Улады дастаткова насцярожана аднесліся да гэтай акцыі, так як лічылі, што з’езд стане платформай для крытыкі афіцыйнай палітыкі. Адзіным святаром у складзе арганізацыйнага камітэта з’езду стаў епіскап Мітрафан. У жніўні 1912 г. ў Маскве пры падтрымцы маскоўскага мітрапаліта Ўладзіміра прайшоў Усерасійскі з'езд практычных дзеячаў па ба-

рацьбе з алкагалізмам, які сабраў ў асноўным святароў праваслаўнай царквы, якія вялі актыўную антыалкагольную дзейнасць. Улічваючы дасягненні ў дадзенай сферы і аўтарытэт, епіскап Мітрафан быў абраны намеснікам старшыні з'езда [2, с. 60–61].

Распачаўся паступовы рост колькасці таварыстваў цвярозасці. Так, калі ў 1900 г. у Расійскай імперыі налічвалася прыкладна 155 таварыстваў цвярозасці, то ў 1913 г. – каля 1800, якія аб'ядноўвалі больш за 500 тыс. удзельнікаў. На 1 студзеня 1911 г. на тэрыторыі беларускіх губерняў існавала 31 таварыства, якія ахоплівалі 1400 чалавек. У параўнанні з іншымі рэгіёнамі імперыі колькасць таварыстваў цвярозасці на тэрыторыі беларускіх губерній была самая нізкая, а агульная колькасць іх удзельнікаў саступала адпаведнаму паказчыку амаль па кожнай асобнай губерні Цэнтральна-Чарназёмнага і Цэнтральна-нечарназёмнага рэгіёнаў Расіі [1].

Аднак колькасны рост не заўсёды адпавядаў якаснаму. У № 12 «Могилёвских епархиальных ведомостей» за 1911 г. прысутнічае такая пазіцыя наконт роста таварыстваў цвярозасці: «Открывали кто только хотел и как только хотел. Открывали и на бумаге, и на самом деле, открывали с помпой, с шутками, «для отчётности», «для отписки», записывали в члены-трезвенники первых пришедших на ум покойников»[11, с. 393]. Аўтар адзначаў, што толькі абсалютная цвярозасць саміх святароў будзе асновай поспеху цвярозага руху: «грех нашего нежелания быть примером воздержания будет грехом историческим, грехом против вверенного нам родного народа, руководителями которого добровольно захотели быть мы, но вывести который из тьмы пьянства на свет Божий не находим ни желания, ни сил»[11, с. 392].

Безумоўна, частка святароў не цуралася алкаголя. Д. Булгакоўскі пад час аднаго з дакладаў пазначаў: «Весьма распространён также между духовенством обычай приглашать прихожан в один из праздничных или воскресных дней на так называемую «помочь»: на жниво, покос, молотьбу. Помочан, обыкновенно, священник угощает ви-

ном, конечно и сам выпивает при этом случае. Не пить, угощая, не принято»[19, с. 34].

Селянін Мікіта Хват, былы работнік святара Е.П. на прапанову апошняга не купляць гарэлку і піва на пахаванне маці адказаў: «А як батюшкова маты померлы, то кулько горілкы і пыва переносів я от Грівца за трі дні? А кулько еще вина брали с погреба?! Правда, дешевша тогды была горилка, а всетаки рублыв на пятьдесят выпили тогды разных напитков. То як-же ж мужыку без горилкы обыйстись?!»[5, с. 462].

Здараліся выпадкі, што цяга да гарэлкі вяла да злаўжыванняў. Па паведамленню Лепельскага павятовага спраўніка ў 1902 г. святар Чарсцвядскай царквы «имеет склонность к употреблению спиртных напитков… за венчание требовал 4 рубля, хлеба, бутылку водки и петуха» [15, арк. 36, 39].

Тым не менш, менавіта царква стала той сілай, якая кіравала распаўсюджваннем ідэй цвярозасці. Крытыка памеранага спажывання алкаголя і цвярозы рух паўплывалі на змену дзяржаўнага курса. З пачатку 1914 г. расійскія ўлады распрацоўваюць праграму па паступоваму скарачэнню продажу і спажывання алкаголя і адыходу ад палітыкі «п’янага бюджэта», аднак пачатак Першай сусветнай вайны не дазволіў яе ажыццявіць – быў абраны шлях жорсткіх адміністрацыйных мер, увядзення «прымусовай цвярозасці». Да гэтага, як высветлілася, ні грамадства, ні ўлада не былі падрыхтаваны.

Гістарычны вопыт паказвае, што пасяховасць барацьбы за цвярозасць залежыць ад узроўня супацоўніцтва ў гэтым накірунку улады, царквы, навукі і грамадства. Як адзначаў епіскап Мітрафан, барацьба з п’янствам павінна стаць справай кожнага: «Как врага на войне общими силами теснят, охватывают и уничтожают, так надо поступать и в отношении алкоголя»[9, с. 29].

## Літаратура і крыніцы

1. Афанасьев, А. Л. Трезвенное движение в России в период мирного развития. 1907 – 1914 годы: опыт оздоровления общества / А. Л. Афанасьев // Твереза література [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://www.literatura.tvereza.info/01/Afanasiev/td 1907-1914. html. Дата доступа: 29.10.2019.

2. Афанасьев, И.Н. Борьба государства и общества за народную трезвость в России: 1861-1914 гг. / Афанасьев Иван Николаевич. – Санкт-Петербург, 2011. – 128 с.

3. Восович, С. М. Роль православного духовенства в утверждении трезвого образа жизни в Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. / С. М. Восович // Вестник Академии МВД Республики Беларусь. – 2008. – № 1. – с. 9 – 11.

4. Григорьев, Н. И. Русские общества трезвости, их организация и деятельность в 1892 – 1893 гг. / Н. И. Григорьев. – Санкт-Петербург: Типография П. П. Сойкина, 1894. – 79 с.

5. Е. П. «Врачу, исцелися сам!» // Гродненские епархиальные ведомости – 1909. – № 42.

6. Из истории борьбы за трезвость на Гроденщине / Правление Гродненской областной организации общества «Знание», Правление Гродненской областной организации добровольного общества любителей книги, Гродненский областной совет добровольного общества борьбы за трезвость. – Гродно, 1986. – 16 с.

7. Извеков, Н. Д. Исторический очерк состояния Православной церкви в Литовской епархии за время с 1839-1889 гг. / Н. Д. Извеков. – Москва: Печатня А.И. Снегирёвой, 1899. – 552 с.

8. Литовские епархиальные ведомости. – 1897. – № 30.

9. Митрофан, епископ. Беседа о вреде алкоголя и средствах борьбы с ним / епископ Митрофан. – Минск.: Электротипография С. А. Некрасова, 1912. – 48 с.

10. Могилёвские епархиальные ведомости. – 1911. – № 3.

11. Могилёвские епархиальные ведомости. – 1911. – № 12.

12. Мяньчэня, С.В. «Цвярозасць народа стане новай свабодай»: антыалкагольная дзейнасць епіскапа Мітрафана Гомельскага (Краснапольскага). // Беларуская думка. – 2015. – №2. – с. 74 – 79.

13. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 2709. – Воп. 1. – Спр. 85.

14. НГАБ (Гродна). – Ф. 1542. – Воп. 1. – Спр. 1.

15. НГАБ. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 45266.

16. НГАБ. – Ф. 2709. – Воп. 1. – Спр. 4.

17. От Святейшего Правительствающего Синода о борьбе с пьянством в народе // Гродненские епархиальные ведомости – 1909. – 26 июля. – С. 301 – 302.

18. Протько, Т. С. В борьбе за трезвость / под ред. М. О. Бича. – Минск: Наука и техника, 1988. – 165 с.

19. Скидан, В.И. Народ против пьянства / В.И. Скидан. – Минск: Наука и техника, 1988. – 77 с.

20. Труды первого Всероссийского съезда по борьбе с пьянством. Санкт-Петербург 28 декабря 1909 г. – 6 января 1910 г. В 3 томах. Т.1. – Санкт-Петербург: Типография П. П. Сойкина, 1910. – 1600 с.

21. Тушинский, Д. А. Попечительства о народной трезвости в 1901 г. / Сост. Д. А. Тушинский. Санкт-Петербург, 1904. – 34, 45, 31 с.

22. Щеглов, Г. Э. Печальник о благе народном. Жизнь и литетурные труды Дмитрия Гавриловича Булгаковского / Г. Э. Щеглов. – Минск: Белорусский экзархат, 2009. – 272 с.